УДК 385.81

# АДНАЎЛЕННЕ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР У ПАСЛЯВАЕННЫЯ ГАДЫ

**Багданчук А. У.**
Навуковы кіраўнік Капкович М. И.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Наступствы Вялікай Айчыннай вайны для Беларусі былі надзвычай цяжкія. У 1940 г. насельніцтва рэспублікі складала каля 10 мільенаў чалавек, у 1945 г. засталося 6,3 мільена. БССР страціла больш за палову свайго народнага багацця. Аднаўленне эканомікі пачалося ўжо восенню 1943 г. 21 жніўня 1943 г. ЦК ВКП(б) і СНК СССР прынялі пастанову «Аб неадкладных мерах па аднаўленні гаспадаркі ў раенах, вызваленых ад нямецкай акупацыі», у якой ставілася мэта – у першую чаргу аднаўляць прадпрыемствы, якія працавалі на патрэбы фронту, перш за ўсе металаапрацоўчыя і машынабудаўнічыя. У 1944 г. у БССР было адноўлена 196 машынабудаўнічых прадпрыемстваў, якія займаліся рамонтам і аднаўленнем вайсковай тэхнікі.

Аднаўленне народнай гаспадаркі планавалася закончыць падчас чацвертай пяцігодкі (1946–1950 гг.). Праходзіла яна ва ўмовах існавання цэнтралізаванай планавай сістэмы эканомікі, з'яўлялася адным з элементаў працэсу мадэрнізацыі. Галоўная ўвага была акцэнтавана на развіцце цяжкай прамысловасці – машынабудаванні, металаапрацоўцы, электраэнергетыцы. Былі пабудаваны МАЗ, МТЗ. На 47 працэнтаў быў перавышаны даваенны ўзровень вытворчасці электраэнергіі. Ствараліся найноўшыя, на той час, буйныя прадпрыемствы легкай прамысловасці

сярод якіх былі Віцебскі дыванова-плюшавы камбінат і шаўкаткацкая фабрыка Мінскі і Гродзенскі тонкасуконны камбінаты. Асабліва хутка ішло аднаўленне і развіцце прамысловасці ў заходніх абласцях БССР. Увогуле і цэлым, па БССР да 1950 г. народная гаспадарка была адноўлена, аднак узровень яе развіцця заставаўся ніжэйшым, чым у цэлым па СССР.

У 1950 г. даўжынячыгункі, якую да таго часу аднавілі, склала 93 % ад даваеннай. Былі пабудаваны масты, вакзалы, паравозныя дэпо. Развіваўся аўтамабільны транспарт. Поўнасцю была адноўлена сувязь: прадпрыемствы, пошты, тэлеграф, тэлефон. Досыць высокі тэмп аднаўлення і развіцця прамысловасці пасля заканчэння вайны быў звязаны з мабілізацыяй усіх чалавечых і матэрыяльных рэсурсаў, якія былі ў той час. Амаль усе насельніцтва ўспрымала рэабілітацыю эканомікі як абавязак перад айчынай.

Ваенныя разбурэнні закранулі і сельскую гаспадарку. За гады вайны моцна скарацілася пагалоўе жывелы, у вesках былі знішчаны і спалены жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Захавалася мізэрная колькасць сельскагаспадарчай тэхнікі. Адразу пасля заканчэння вайны сельская гаспадарка была не ў сілах забяспечыць краіну патрэбнымі прадуктамі. Таму да 1947 г. існавала картачная сістэма забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання.

За гады правядзення чацвертай пяцігодкі быў амаль поўнасцю адноўлены даваенны ўзровень пасяўных плошчаў, пашыраны пасевы тэхнічных культур, забяспечаны значны рост пагалоўя жывелы. Нягледзячы на гэтае становішча калгаснага сялянства заставалася вельмі цяжкім. Платай за іх самаадданасць былі працадні, якія забяспечваліся малой колькасцю прадуктаў. Жылі калгаснікі за кошт таго, што мелі са сваіх агародаў. Амаль уся прадукцыя з калгасаў прадавалася дзяржаве па нізкіх коштах.

Грамадскія арганізацыі былі прадстаўлены прафсаюзамі, Ленінскім Камуністычным Саюзам Моладзі Беларусі, спартыўныя, абаронныя, навуковымі. Асноўнай задачай прафсаюзаў была мабілізацыя працоўных на аднаўленне прадпрыемстваў. З мэтай павышэння актыўнасці працоўных, яны праводзілі нарады,заключалі калектыўныя дагаворы з адміністрацыяй прадпрыемстваў. Пры гэтым гістарычна ўласцівая прафсаюзам функцыя сацыяльнай абароны правоў і інтарэсаў працоўных адступала на другарадныя пазіцыі. У грамадскім жыцці моладзі гэтых гадоў важную ролю адыгрываў Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі. ЛКСМБ у 1945 г. быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга за мужнасць, праяўленую камсамольцамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Камсамол аб'ядноўваў большасць маладых людзей, якія працавалі і вучыліся. Камсамол клапаціўся аб ідэйна-палітычным выхаванні моладзі ў адпаведнасці з партыйнымі наканаваннямі. Камсамольскія арганізацыі рэспублікі накіравалі дзясяткі тысяч юнакоў і дзяўчат на будоўлі і прамысловыя прадпрыемствы, стварылі там звыш 2 тыс. камсамольска-маладзежных брыгад.

Высокімі тэмпамі ішло жыллевае будаўніцтва. За паваенную пяцігодку краіна змагла пабудаваць жылле для 2 млн чалавек. Жыллевы фонд г. Мінска быў адноўлены на 80 %, іншых гарадоў рэспублікі – прыкладна на 50 %. Гэта быў значны крок, калі ўлічыць маштабы разбурэнняў у гарадах, сельскіх населеных пунктах Беларусі [1, с. 281].

У 1959–1965 гадах паскоранымі тэмпамі развіваліся прыборабудаванне, электроніка, радыеэлектроніка, машынабудаванне. Была ўведзена ў строй Бярозаўская электрастанцыя, што дало магчымасць стварыць адзіную Беларускую энергасістэму. Пачалі працу Першы калійны камбінат у Салігорску, Гродзенскі азотнатуковы, Полацкі нафтаперапрацоўчы заводы і шэраг іншых буйных прадпрыемстваў.

Аднаўляласядзейнасць школ. У 1944–1945 навучальным годзе ўжо дзейнічала больш за 10 тыс. агульнаадукацыйных школ, у якіх навучалася 1 260 тыс. дзяцей. Аднак з-за недахопу школьных памяшканняў даводзілася праводзіць заняткі ў звычайных сялянскіх дамах. Школы не былі поўнасцю забяспечаны школьным інвентаром, не хапала падручнікаў. У час вайны была практычна поўнасцю разбурана матэрыяльна-тэхнічная база навукі і культуры рэспублікі. Важна было, у першую чаргу, аднавіць народную адукацыю [2, с. 100].

Ужо ў 1946–1947 навучальным годзе ў Беларусі працавала 11 300 школ, у 1950 – 12 тысяч. Вельмі цяжкім было становішча з настаўніцкімі кадрамі. Да 1 студзеня 1946 г. у школы з эвакуацыі вярнулася каля 5 тысяч настаўнікаў, а таксама каля 7 тысяч дэмабілізаваных настаўнікаў з фронта. У 1949–1950 навучальным годзе пачаўся пераход да ўсеагульнай абавязковай сямігадовай адукацыі, які ў асноўным быў скончаны да сярэдзіны 1950-х гг. Зменшылася колькасць беларускіх школ. У Мінску ў 1945–1946 навучальным годзе з 28 школ 14 былі беларускімі, а ў 1952–1953 з 46 школ толькі 9 засталіся беларускімі.

Аднаўлялася сярэдняя спецыяльная адукацыя – тэхнікумы і вучылішчы. Да 1955 году іх налічвалася 123. За першае пасляваеннае дзесяцігоддзе было падрыхтавана каля 90 тысяч адмыслоўцаў сярэдняга звяна.

Аднаўлялася вышэйшая школа рэспублікі. У 1945 г. з 25 даваенных ВНУ працавала 22. Адкрываліся новыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, у іх ліку – Мінскі інстытут замежных моў, Брэсцкі, Полацкі педагагічныя і Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытуты. Вышэйшай школай за пасляваеннае дзесяцігоддзе было падрыхтавана 50 тысяч спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. Пасля вызвалення Мінска аднавілася работа Акадэміі навук БССР.

Хуткімі тэмпамі ў рэспубліцы аднаўлялася сетка лячэбных устаноў. У канцы 1945 г. працавала 597 бальнічных устаноў, 207 жаночых і дзіцячых кансультацый, 1 296 фельчарска-акушэрскіх пунктаў [1, с. 99].

Напачатку 50-х гадоў рэальна павялічылася матэрыяльнае дабрабыт народа. Заработная плата вырасла прыкладна на 39%, даходы калгаснікаў у сярэднім на аднаго работніка – паўтара раза. Аб'ем тавараў народнага спажывання ў цэлым адпавядаў фонду заработнай платы, рынак быў адрэгуляваны. Такім чынам, у пасляваенныя гады, пераадолеўшы цяжкасці, БССР на працягу наступных дзесяцігоддзяў стала эканамічнай і культурнай рэспублікай у складзе СССР. У гэты перыяд быў закладзены непарушны фундамент беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, які вытрымаў выпрабаванне часам, стварыў надзейную аснову будаўніцтва суверэннай Рэспублікі Беларусь.

## Літаратура

1. История Беларуси в контексте европейской истории. – Минск : ОАО Полиграфкомбинат им. Я. Коласа, 2004. – 332 с.

2. Великая Отечественная война советского народа (В контексте Второй Мировой войны). – Гомель : Белорусский государственный университет транспорта, 2015. – 123 с.